# РАЁННАЯ ГАЗЕТА «ЖЫЦЦЁ ПАЛЕССЯ»: МОЎНА-СТЫЛІСТЫЧНЫ АСПЕКТ

**Я. М. Любіна**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*lubinazena@gmail.com,*
*навуковы кіраўнік – Г. І. Басава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

У артыкуле даследуюцца моўна-стылістычныя асаблівасці раённай газеты «Жыццё Палесся». Дзякуючы сваёй лакальнасці, раённая газета сёння з’яўляецца важным складнікам жыцця людзей канкрэтнай мясцовасці. Артыкул раскрывае перадумовы запатрабаванасці дадзенага тыпу СМІ. Намі выяўлены тыповыя характарыстыкі раённага друку, а таксама яго роля ў фарміраванні моўнай культуры жыхароў раёна.

***Ключавыя словы:*** раённая газета; моўна-стылістычны аспект; канцылярызмы, інтэртэкстуальнасць; рэмінісцэнцыя; моўны штамп.

Рэгіянальная прэса па ўздзеянні на чытача не толькі не саступае рэспубліканскай, а ў некаторай ступені нават пераўзыходзіць яе. А. П. Грос адзначае, што лакальныя СМІ больш карысныя і эфектыўныя, чым агульнанацыянальныя. Перыядычныя выданні пэўнай тэрыторыі дапамагаюць праводзіць дэцэнтралізацыю, што з’яўляецца важным аспектам масмедыя. Рэгіянальныя выданні асаблівую ўвагу надаюць праўдзе і аб’ектыўнасці пры высвятленні праблем, якія турбуюць мясцовых жыхароў, уважліва адносяцца да чалавека працы [1, с. 297]. Цэнтральны блок раённай газеты, як правіла, займаюць тэмы сацыяльнай сферы. На другім месцы знаходзіцца эканоміка. І толькі трэцяе месца займае палітыка. Разуменне большасці гэтых тэм журналістамі-раёншчыкамі і жыхарамі раёна часта супадаюць [2, с. 147–149].

Галоўная задача газеты «Жыццё Палесся» – прадастаўленне жыхарам горада Мазыра і Мазырскага раёна навін рэгіёна, краіны і свету. Намі было прааналізавана 165 нумароў з лістапада 2020 г. па лістапад 2021 г. на прадмет стылістычных асаблівасцей тэкстаў.

Пераважна ў газеце выкарыстоўваецца літаратурная кніжная лексіка. Але часам аўтары звяртаюцца да слоў з эмацыйнай афарбоўкай або да слоў іншых стыляў. Напрыклад, словы ***«унюхать»*** і ***«пищалка»*** (*«Если прибор качественный, то он может **“унюхать”** в воздухе одну тысячную процента опасной примеси <…> А **“пищалка”** на батарейках и того меньше – всего 30 рублей»* (28.11.2020)) адносяцца да гутарковага стылю.

Яшчэ адной спецыфічнай рысай газетнай мовы з'яўляецца своеасаблівая вобразнасць. Журналісты газеты «Жыццё Палесся» імкнуцца надаваць тэкстам эстэтычную афарбоўку, напаўняючы матэрыялы разнастайнымі мастацкімі тропамі, якія надаюць большую эмацыйнасць тэксту. Сярод сродкаў мастацкай выразнасці намі выяўлены **метафары** (*брали высоты* (03.11.2020), *грибная охота* (06.11.2020), *сельскохозяйственный гигант подвел итоги* (27.02.2021)), **эпітэты (***мир черно-белый* (02.11.2020)), **параўнанні** (*«И наша собеседница, действительно, словно огонек, освещающий спортивный путь своих воспитанников»* (03.11.2020)). Таксама сустракаюцца ўстойлівыя выразы: **фразеалагізмы, прыказкі. прымаўкі, перыфразы (***тише едешь – дальше будешь* (05.02.2021), *мир иной* (29.03.2021), *нечего на зеркало пенять* (24.07.2021)). Зрэдку можна сустрэць і **антытэзу**, напрыклад, *«у* ***звычайным*** *убачыць* ***незвычайнае****»* (20.04.2021).

Адметнасць мовы газеты «Жыццё Палесся» – ацэначнасць, якая можа выражацца як на сінтаксічным, так і на лексічным узроўнях. Да праяў такой з'явы адносіцца інверсія, словы з ацэначнымі адценнямі і марфемамі (*сдирают кучу денег* (03.11.2020), *полочка для необычных книг* (15.09.2021)); пабочныя канструкцыі, што запрашаюць да разваг і надаюць даверлівы тон выказванню, паўторы, рытарычныя пытанні, пабуджальныя і клічныя сказы.

Частай з'явай на старонках газеты «Жыццё Палесся» з'яўляюцца канцылярызмы. Нярэдка іх можна сустрэць у выказваннях людзей, але ёсць і такія, якія выкарыстоўваюць самі журналісты. Прысутнічаюць і моўныя штампы, што дрэнна сказваецца на развіцці мовы газеты. Моўныя ж стандарты выкарыстоўваюцца зрэдку. На старонках газеты за прааналізаваны перыяд цалкам адсутнічае штамп *«сёняшні дзень»/«сегодняшний день»*. Сярод самых распаўсюджаных штампаў можна адзначыць *«на дадзены момант»* і *«актуальныя праблемы»*. Сярод іншых моўных штампаў адзначаюцца *«чорнае золата»*, *«чырвоная зона», «держать руку на пульсе»*, *«запал в душу»* і інш. Яркім прыкладам нематываванага спалучэння вялікай колькасці канцылярызмаў служаць сказы: *«Когда-то пятиклассница Юля из деревни Пласток Любанского района Минской области* ***ступила на тропу*** *спортивных свершений,* ***свернуть*** *с которой уже* ***не смогла****. Но Юлия Анатольевна оказалась* ***настоящим бойцом****, ведь не побоялась трудностей и решила кардинально изменить свою жизнь, сменив тренерскую деятельность на педагогическую»* (03.11.2020).

Каб наблізіць тэкст да чытача аўтары невыпадкова выкарыстоўваюць інтэртэкстуальнасць. Напрыклад, звяртаючыся да алюзіі, журналісты згадваюць агульнавядомыя імёны, месцы, творы і інш. Можна адзначыць наступныя віды алюзій: **антрапанімічныя (***«Как* ***Чехов, Булгаков, Ак-***

***сенов** и другие гении, в искусство он пришел из медицины»* (13.07.2021)), **сітуацыйныя,** што дапамагаюць аўтару даць магчымасць чытачам правесці паралель паміж мінулым і цяперашнім (*«Вспомните, к чему привела череда так называемых **“цветных революций”**, и даже не мятежей на постсоветском пространстве»* (11.02.2021)), **тапанімічныя,** асаблівасць якіх заключаецца ў прывязцы да геаграфічных назваў блізкіх да Мазыршчыны (*«Для нас первая ассоциация с **Наровлей** – вкусности от **“Красного Мозырянина”**…»* (28.11.2020), *«…нередко зарубежные столицы мы знаем лучше, чем соседние **Калинковичи**»* (28.11.2020)), **хрананімічныя**, найперш звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной (*«**22 марта 1943 года** – трагическая дата в истории белорусского народа»* (21.03.2021)).

З дапамогай рэмінісцэнцыі журналісты выкарыстоўваюць ужо гатовыя творы дзеля сваіх мэт, відазмяняючы першапачатковы варыянт. Адзначаюцца як **эксплiцытныя** (*«Что посеешь в юности, то пожнешь в зрелости»* (14.02.2021)), так і **імпліцытныя рэмінісцэнцыі** (*«Давайте, учиться, трудиться, любить…»* (30.10.2021)).

Дзеля пацвярджэння сваіх слоў або для стварэння пэўнай інтанацыі журналісты звяртаюцца да цытат. Напрыклад, у адным з рэпартажаў Дзмітрыя Куліка некалькі разоў выкарыстоўваюцца ўрыўкі з песень (уласныя цытаты): *«Им, небольшим, потерян счет, а жизнь рекой течет, и в этих тихих городах…» – строки известной песни невольно всплывают в памяти, когда открываешь для себя белорусскую глубинку», «Мой милый, если б не было войны…»* (21.11.2021). Гэта надае тэксту мілагучнасць і вобразнасць, дазваляе стварыць «эфект прысутнасці». З мэтай стварэння пэўнай афарбоўкі выкарыстоўваюцца і асобныя ўкрапіны ўласных цытат, тыпу *«На землю выпала роса – на вид обычная вода, а это чья-нибудь слеза, а это чья-нибудь беда…»* (11.07.2021) (вядомы куплет з песні Алы Пугачовай «Еду к тебе»). Да трансфармаваных цытат адносяцца наступныя варыянты прыказак і прымавак: *«Мама, папа, я – за охрану труда»* (08.09.2021), *«На страже здоровья – госсаннадзор»* (30.10.2021), *«Готовь печку летом, а телегу – зимой»* (24.08.2021).

На сёння мова раённага друку з’яўляецца некалькі зніжанай, што можа, з аднаго боку, стаць прычынай змяншэння колькасці аўдыторыі, а з другога – прычынай зніжэння пісьменнасці чытачоў. Што датычыцца літаратурнай нормы газетнай мовы, трэба адзначыць, што моўныя хібы прысутнічаюць даволі рэдка. Самымі яркімі прыкладамі парушэння норм газетнай мовы з’яўляюцца памылкі пры аднародных членах сказа: *«Ежемесячно мы выпускаем от 4 до 5 тыс. стульев, а еще кресла, банкетки, табуреты, столы, садовую мебель, сырой пиломатериал»* (12.11.2020). Спачатку названы

аднародныя прадметы і ў канцы ***«сырой пиломатериал»***, які не з'яўляецца аднародным паняццем і не можа стаяць у адным радзе з астатнімі. Памылка дапушчана і ў сказе *«...совершенствуя и развивая свои знания и навыки...»* (06.11.2020). Калі ўменні сапраўды можна ўдакладняць і развіваць, то веды можна толькі ўдакладняць. Прысутнічаюць памылкі ў выбары адпаведнай формы склону або ліку: *«С центральных улиц на дворовые территории: благоустройства Мозыря продолжается»* (03.11.2020). Намі выяўлены памылкі ў кіраванні: *«...выбор пал на факультет "физическая культура и тренерская работа"»*. Можна таксама заўважыць, што журналісты выкарыстоўваюць нанізванне назоўнікаў, што надае тэксту канцылярскую афарбоўку: *«Он проводится с* ***целью повышения интереса учащихся к изучаемым*** *естественно-учебным* ***предметам, привлечения ребят к*** *исследовательской, экспериментальной и практической* ***деятельности,*** *а также* ***выявления и поддержки*** *наиболее способных и одаренных* ***учащихся»*** (16.04.2021).

Такім чынам, журналісты газеты «Жыццё Палесся» для надання аўтарскага гучання матэрыялам выкарыстоўваюць метафары, эпітэты, параўнанні і інш. Таксама яны выкарыстоўваюць інтертэкстуальнасць, што дапамагае перадаць пэўную інтанацыю, а таксама стварыць культурную, гістарычную і часавую атмасферу для чытача. У раённай газеце сустракаюцца моўныя клішэ і канцылярызмы, што ў значнай ступені зніжае ўзровень культуры мовы выдання. Сёння раённая газета даволі часта становіцца адзінай, якую выпісвае сям'я, таму журналістам патрэбна звяртаць большую ўвагу на моўна-стылістычную дасканаласць тэкстаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Гросс Е. П.* Региональные особенности организации международных связей общественных объединений Республики Беларусь в 1991–2010 гг. // Беларусь в современном мире = Беларусь у сучасным свеце: материалы XII Междунар. конф., посвященной 92-летию образования Белорусского государственного университета, 30 октября 2013 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. Минск: Изд. центр БГУ, 2013. С. 297–298.
2. *Тумилович Н. В.* Жанрово-тематическая трансформация районной прессы (на примере борисовской газеты «Адзінства») // Рэгіянальныя СМІ ў сучаснай інфармацыйнай прасторы: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. семінара, 2–3 чэрв. 2011 г., Мінск / рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2011. С. 146–151.